УДК 745/749:001.89-057.875

***Н. А. Лінькова,***
*выкладчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

# НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ СТУДЭНТАЎ ПА ЗАХАВАННІ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў МАЙСТЭРНЯХ КАФЕДРЫ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОГА МАСТАЦТВА

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па захаванні аднаго з найважнейшых складнікаў культурнай спадчыны Беларусі – традыцыйнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Дзякуючы атрыманым у навучальных майстэрнях кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ведам у галіне тэхналогіі мастацкай апрацоўкі прыродных матэрыялаў, а таксама ў напрамку рэканструкцыі і рэстаўрацыі прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, студэнты ў працэсе стварэння ўласных творчых работ імкнуцца пераасэнсоўваць дасягненні нацыянальнай традыцыйнай культуры шляхам уласнай навукова-даследчай дзейнасці.

**Ключавыя словы:** дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, культурная спадчына, навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў, нацыянальная культура, традыцыі, сучаснае мастацтва.

***N. Linkova,***
*Lecturer of the Department of Decorative and Applied Arts of the Educational Institution "The Belarusian State University of Culture and Arts"*

# RESEARCH ACTIVITY OF STUDENTS ON THE PRESERVATION OF CULTURAL HERITAGE IN THE WORKSHOPS OF THE DEPARTMENT OF DECORATIVE AND APPLIED ARTS

**Abstract.** The article examines the research activities of students of the Belarusian State University of Culture and Arts to preserve one of the most important components of the cultural heritage of Belarus – traditional decorative and applied arts. Thanks to the knowledge gained in the educational workshops of the Department of Decorative and Applied Arts in the field of technology of artistic processing of natural materials, as well as in the direction of reconstruction and restoration of objects of decorative and applied art, students in the process of creating their own creative works try to rethink the achievements of national traditional culture through their own research activities.

**Keywords:** decorative and applied art, cultural heritage, research activities of students, national culture, traditions, contemporary art.

Традыцыйнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва – адно з найважнейшых складнікаў культурнай спадчыны Беларусі. Прафесійная школа сучаснага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі сфарміравана, у большай меры, на аснове нацыянальнай культуры. Дасканалае вывучэнне характэрных асаблівасцей старажытных вырабаў традыцыйнага ганчарства, ткацтва, вышыўкі, разьбы па дрэве, коўкі і ліцця металу, шкларобства і саломапляцення адкрывае перад мастакамі нашага часу бязмежныя перспектывы ў пошуку новых арыгінальных ідэй і пластычных рашэнняў [2, с. 115].

Адной з вядучых устаноў адукацыі ў гэтай галіне з’яўляецца Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. На базе кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва факультэта мастацкай культуры на працягу ўжо больш за 25 гадоў паспяхова вырашаюцца праблемы захавання, адраджэння і развіцця ў сучасных умовах унікальнай культурнай спадчыны беларускага народа. Будучыя майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва атрымліваюць фундаментальныя тэарэтычныя і практычныя веды ў галіне тэхналогіі мастацкай апрацоўкі прыродных матэрыялаў, а таксама ў напрамку рэканструкцыі і рэстаўрацыі прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Варта адзначыць, што за гэты перыяд падрыхтавана значная колькасць высокапрафесійных спецыялістаў, якія працягваюць працу па адраджэнні, захаванні, развіцці і трансляцыі традыцыйнага народнага мастацтва ў сацыякультурнай сферы сучаснага грамадства. Дарэчы, галоўнай задачай педагогаў кафедры з’яўляецца абучэнне маладых спецыялістаў, якія на аснове трывалай агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі здольныя творча пераасэнсаваць багацце нацыянальнай культурнай спадчыны і ажыццявіць новыя адкрыцці ў галіне сучаснай культуры і мастацтва [1].

За кафедрай замацаваны вучэбныя майстэрні, якія адпавядаюць абраным профільным відам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, бо студэнты старшых курсаў выбіраюць для паглыбленага вывучэння толькі адзін з відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (кераміка, ткацтва, габелен, саломапляценне, мастацкі роспіс), а таксама майстэрні па рэстаўрацыі

прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, жывапісе, малюнку, кампазіцыі, скульптуры і інш. У сваю чаргу, кожная з пералічаных майстэрняў з’яўляецца не толькі вучэбнай аўдыторыяй, але і сапраўднай творчай лабараторыяй для будучых спецыялістаў у галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Звернем увагу на тое, што навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў з’яўляецца адной з найбольш важных задач дзейнасці кафедры. На працягу ўсяго перыяду існавання кафедры яе прафесарска-выкладчыцкі састаў і творчая моладзь паспяхова вырашалі навуковыя пытанні ў сістэме дзяржаўных бюджэтных тэм: «Традыцыйныя рамёствы Беларусі», «Народнае мастацтва як аснова нацыянальнай мастацкай школы», «Народнае мастацтва ў кантэксце развіцця сучаснага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва» і інш. У цяперашні час на кафедры працуюць над навуковай тэмай «Уплыў рэгіянальных традыцый народнай творчасці на развіццё сучаснага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі».

Матэрыялы даследаванняў студэнтаў і іх педагогаў знаходзяць адлюстраванне ў навуковых артыкулах, матэрыялах і тэзісах навукова-практычных канферэнцый. Лепшыя навуковыя працы студэнтаў кафедры, у тым ліку дыпломныя праекты, удзельнічаюць у рэспубліканскім конкурсе навуковых прац студэнтаў. Напрыклад, каб выканаць навуковае даследаванне «Асаблівасці лепкі і дэкору дробнай дэкаратыўнай пластыкі цэнтральнага рэгіёна Беларусі (на прыкладзе керамікі Івянца і Ракава)» для вышэйназванага конкурсу ў 2021 г. студэнтцы 3-га курса Інэсе Агіевіч, пачынаючы з самых першых заняткаў па прадмеце «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» на базе майстэрні мастацкай керамікі і ганчарства кафедры, неабходна было на практыцы асвойваць спосабы лепкі з пласта і на ганчарнай аснове, аналізаваць іх асаблівасці першапачаткова па ўзорах (арыгінальных работах або іх дакладных копіях), а пасля выконваць аўтарскія працы па матывах традыцыйнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Такая ж методыка ўжывалася і на этапе дэкарыравання керамічных вырабаў. Акрамя практычных і тэарэтычных ведаў, атрыманых у працэсе падрыхтоўкі ад выкладчыкаў і майстроў вытворчага навучання ўстановы адукацыі, студэнтка самастойна вывучала літаратуру па дадзенай тэме, наведвала музейныя экспазіцыі патрэбнай

накіраванасці, а таксама на працягу некалькіх гадоў навучання разам са сваімі аднагрупнікамі прымала ўдзел у студэнцкіх навукова-практычных канферэнцыях. Аднак працу над актуальнай тэмай неабходна будзе працягваць да абароны дыпломнай работы. Бо менавіта на выставах-абаронах дыпломных работ студэнты дэманструюць не толькі вынікі творчай, але і навукова-даследчай дзейнасці, раскрываючы паэтапна ў тлумачальнай запісцы і графічным планшэце методыку стварэння свайго аўтарскага твора дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Адзначым, што вынікі навуковых даследаванняў па традыцыйнай беларускай кераміцы, ткацтве, саломапляценні і іншых відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва атрымалі развіццё ў эксперыментальнай творчасці студэнтаў. Дабавім, што ў адпаведнасці з праграмай навукова-творчай лабараторыі ўніверсітэта «Народныя рамёствы беларусаў» (з 2002 г.) былі адноўлены, рэстаўраваны і рэканструяваны старажытныя тэхнікі і тэхналогіі мастацкага ткацтва і керамікі беларусаў, якія ўключаны ў навучальны працэс кафедры. У выніку эксперыментальна-творчых распрацовак па аднаўленні і развіцці разнавіднасцей традыцыйных тэхнік і прыёмаў выбарнага, пераборнага, ажурнага ткацтва; традыцыйнага ганчарства і лепкі дробнай дэкаратыўнай пластыкі, а таксама аднаўленне традыцыйных тэхнік і прыёмаў па іх дэкарыраванні (абвара, задымленне, глянцаванне і інш.); тэхналогій старажытнай вышыўкі, класічнай шпалеры, роспісу па тканіне і па-за шклом, студэнтамі пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры была зроблена вялікая колькасць творчых прац.

Такім чынам, значную частку ведаў студэнты кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва атрымліваюць у працэсе ўласнай даследчай працы, у асноўным у вучэбных майстэрнях, але пад кіраўніцтвам высокакваліфікаваных педагогаў, якія накіроўваюць іх у патрэбнае рэчышча. А вучэбныя, курсавыя і дыпломныя працы з’яўляюцца, як правіла, вынікам навуковага даследавання і творчага пераасэнсавання нацыянальных традыцый у галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Дзякуючы ведам, атрыманым у творчых майстэрнях універсітэта, студэнты кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў працэсе стварэння творчых работ імкнуцца пераасэнсоўваць дасягненні нацыянальнай традыцыйнай культуры. Сярод выпускнікоў і

студэнтаў кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва налічваецца не адзін дзясятак лаўрэатаў міжнародных, рэспубліканскіх выстаў-конкурсаў і творчых фестываляў, стыпендыятаў і лаўрэатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, членаў творчых саюзаў.

---


*1.* Кафедра декоративно-прикладного искусства [Электронны рэсурс] // Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. – Рэжым доступу: http://www.buk.by/university/organizational-structure/chairs/traditional/cultural-studies4672/. – Дата доступу: 28.01.2022.

*2. Непочелович, А. И.* Арт-проект «Извечная красота» в системе развития национальных традиций / А. И. Непочелович, Т. И. Васюк // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : (памяці антраполага Зінаіды Мажэйкі) : зб. навук. прац удзельнікаў XIII Міжнар. навук. канф., Мінск, 26–28 крас. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў [і інш.]. – Мінск, 2019. – Вып. 13. – С. 114–115.



УДК 791/792+005:378.147-057.875



***А. В. Макаревич,***
*кандидат искусствоведения, доцент, заведующий кафедрой менеджмента социально-культурной деятельности;*

***А. М. Стельмах,***
*кандидат искусствоведения, доцент, доцент кафедры менеджмента социально-культурной деятельности учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*


## АКТУАЛЬНЫЕ ФОРМЫ И МЕТОДЫ УПРАВЛЯЕМОЙ САМОСТОЯТЕЛЬНОЙ РАБОТЫ МАГИСТРАНТОВ (на примере дисциплины «Менеджмент в зрелищных видах искусства»)


**Аннотация.** В статье раскрываются актуальные формы и методы управляемой самостоятельной работы, используемые на II ступени получения образования при преподавании дисциплины «Менеджмент в зрелищных видах искусства», позволяющие магистрантам глубже изучить вопросы развития кинематографической отрасли и театрального дела, постичь специфику управления театральным процессом в государственном и частном театрах, а также особенности управления организациями кинопроката и кинопоказа.



**Ключевые слова:** магистратура, самостоятельная работа, формы, методы, кинематограф, театр, управление.